Клепча А.В., студ. гр. 120 б ФТБКіСМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Тычко Г.К.,
докт. філал. навук, прафесар

# ІВАН ПАЎЛАВІЧ МЕЛЕЖ ВА ЎСПАМІНАХ СУЧАСНІКАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Іван Паўлавіч Мележ. Усе мы ведаем яго знакамітыя творы «Мінскі напрамак», «Палеская хроніка», але які гэта быў чалавек, які трэба мець характар, каб стварыць творы напоўненыя глыбінёй душы беларускага народа, яго лёсу і рэальнага жыцця. Каб зразумець цудоўнага пісьменніка, я звярнулася да ўспамінаў сяброў Івана Паўлавіча, яго блізкіх людзей і знакамітых знаёмых пісьменнікаў.

«У памяці ўдзячна-спалоханай, паўстае мажны, вонкава спакойна-разважлівы, а ў душы бянтэжліва-засцярожаны майстар, які ведае слова на вагу і славу, на цяжар. Слова слухалася яго, ім ён мог выказаць самае патаемнае і самае глыбіннае пачуццё. Слава, заслужаная сумленнем і працай, цягнула да новых подзвігаў у імя роднай культуры, у імя літаратуры беларускай, дзеля якой ён жыў, паветрам якой ён дыхаў, клапоцячыся, каб чыстым і здаровым было яно», — прыгадваў Рыгор Барадулін.

Патрабавальнасць у творчасці, бадай, самая галоўная якасць Мележа як пісьменніка і чалавека. Ціхая ўдумнасць характару праяўлялася літаральна на кожным кроку. Пагаварыць з ім было прыемна. І нават на любую тэму. Іван Паўлавіч умеў сцісла выказаць свае думкі і любіў субяседніка слухаць. Натуральнасць, прастата Івана Мележа хутка збліжала яго з людзьмі. Хацелася слухаць і слухаць вялікага мастака слова. Ён ахвотна адказваў на пытанні, якія галоўным чынам датычылі псіхалогіі мастацкай творчасці. Усіх уражвала глыбіня эрудыцыі пісьменніка, дакладнасць яго ацэнак. Кожную думку ён стараўся падмацаваць фактамі з вопыту сваёй творчай

біяграфіі,часта падкрэсліваючы цяжкасці, з якімі яму даводзілася сустракацца на літаратурным шляху.

«Я працую павольна, – гаварыў ён. – Перыяд падрыхтоўкі, уваходжання ў матэрыял адбірае шмат часу. І з крытыкамі ў мяне не заўсёды лады. Часам у нас розныя падыходы да ацэнкі твораў. Мяне часам упікаюць несправядліва. Але не трэба востра рэагаваць на гэта. Крытыка - стымул. Карыснае трэба прыняць, наноснае, шалупінне – адкідваць. І спакойна працаваць, працаваць да сёмага поту».

Ён заўсёды заставаўся спакойным, дабразычлівым, сардэчным, чуйным да чужых боляў і нягод, гатовым заўседы прыйсці на дапамогу чалавеку. Заўседы шукаў сэнс жыцця, чалавечых адносін.

Мабыць, самае страшнае ў чалавечых адносінах, гэта чэрствасць і абыякавасць, калі чалавек, які апярэдзіў цябе, у літасці тыкне руку, а сам глядзіць у другі бок, каб хутчэй уцячы, лепей бы з такім не сустракацца.

А вось Іван Паўлавіч як бы ні спяшаўся, у яго заўседы знаходзілася добрае слова і вельмі харошая, асаблівая мележаўская ўсмешка. Успаміны Сяргея Грахоўскага. «Калі ты нешта новае надрукаваў, ён абавязкова заўважыць і скажа. Хоць ён быў куды маладзейшы за мяне, але часта звяртаўся проста на «ты», відаць, хацеў парушыць мяжу афіцыйнасці, а ў мяне вось ніяк не выходзіла так натуральна і проста, гэта самае «ты». Мабыць, замінала асаблівая павага да таленту і маштабу гэтага пісьменніка. Яго цікавіла, як жылі раней паэты, дзе кватаравалі, як зараблялі, ці часта збіраліся ў Доме пісьменніка, якая там была атмасфера. І я расказваў: «Жылі галаднавата, але дружна і весела, шчыра і адкрыта крытыкавалі адзін аднаго і заставаліся самымі лепшымі сябрамі».

Іван Мележ крутнуў галавою: «Аж не верыцца. Паспрабуй цяпер пакрытыкаваць ці хоць зрабіць заўвагу. А калі яшчэ пры пасадзе, тады сцеражыся… Прымаюць толькі пахвалу. Не праўду ў вочы, бо дбае пра лёс таварыша, хоча дабра яму і чытачу». Іван Мележ сапраўды думае, што падхалім – люты вораг літаратара і літаратуры. Толькі друг скажа праўду ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вочы. Мележ вучыў казаць праўду, вучыў быць шчырым, сумленным, вучыў шанаваць роднае слова. Яго прысутнасць у нашай літаратуры ставіла ўсё на сваё належнае месца, не давала магчымасці самарэкламнікам выстаўляць напаказ сваю персону. Яго прысутнасць павінен адчуваць кожны, хто хоча сказаць сваё слова ў літаратуры.

Іван Паўлавіч Мележ – таленавіты мастак, грамадскі дзеяч, чалавек і друг. Актыўна і сумленна выконваў свае службовыя і грамадскія абавязкі і ў шматлікіх паездках па нашай краіне, і ў камандзіроўках за мяжу, у Вярхоўным савеце нашай Рэспублікі, у Рэспубліканскім камітэце абароны міру. Ён меў асаблівасць добрага дакладчыка. Іван Паўлавіч трымаўся на трыбуне так спакойна і натуральна, нібы выступаў кожны дзень. Манера гаварыць свабодная, лексіка багатая.

Ён хутка авалодваў поўнай увагай аўдыторыі. Заўседы было ясна, калі Іван Паўлавіч выступае, то заўседы скажа нешта важнае і патрэбнае, калі ўносіць прапанову, то варта прыслухацца, калі праводзіць сход, нараду ці пасяджэнне, то ўсё ў яго пройдзе па-дзелавому, з карысцю для справы.

Але і ў Мележа, як і ў кожнага з жывых, тым болей – у актыўна разумна жывых, былі свае чалавечыя недахопы. Зрэшты, не ведаю, што тут можна лічыць недахопам, а што прыроднай асаблівасцю характару.

Скажам, тое ў Івана, не зусім правільна зразумелае жаданне «зашмат» гаварыць пра сваё. Але ж пра што гаварыць! Не пра кватэру, дачу, машыну, не пра званні ды ўзнагароды, не пра высокія знаёмствы ды прыхільнасці ён не гаварыў, а пра галоўнае сваё, тое, што ўжо і нам, як чытачам яго, належала, належыць і застаецца нашым, – як што напісана, як пішацца, як не пішацца, як хацелася б напісаць… Другі яго «недахоп», другая асаблівасць – і сапраўды ён быў лёгка, залішне лёгка ранімы. Але Мележ, у прыклад многім з нас, умеў таксама не быць дробязна помслівым, стаяць вышэй за асабістыя крыўды і крыўдачкі, умеў памятаць самае галоўнае – справу сумленнага служэння народу словам. За што ён браўся, тое рабіў з усёй аддачай сіл і не цярпеў пустога здзеку з дарагое справы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нягледзячы на дрэннае здароўе, Іван Паўлавіч многа працаваў, аддаючыся поўнасцю сваёй любімай справе. Працаваў многа і самаадана, не шкадуючы сябе. Яго працавітасць здзіўляла ўсіх, хоць большую частку года ён знаходзіўся ў бальніцах, або санаторыях. Але і там ён працягваў працаваць. І так на працягу многіх гадоў.

Іван Паўлавіч быў шчаслівы чалавек. Гаворачы словамі Пушкіна: любімец багоў! Але гэта не тое, што любімчык. Любімчыка багі і жыццё так залашчаць, закормяць, што не раскрываецца і тое багацце, талент, што дадзены яму ад прыроды. Затое «любімца багоў», калі гэта пісьменнік, не абыдзе нічога: што міру, тое і бабінаму сыну! Ён сам шукае сабе і працу звыш меры і лёс нялёгкі. І ў гэтым яго шчасце. Іван Паўлавіч шчасліва нарадзіўся сярод людзей, якія ведалі столькі песен і таямнічых гісторый пра чалавечыя лёсы, у краі, дзе, як з гордасцю сам Мележ казаў «карэнным» роду самога Дастаеўскага…

Вайна, якую мы перажылі, вытрымалі, – вялізарнае няшчасце для народа… Але калі яна ужо была, тая вайна, дык падвойным няшчасцем для пісьменніцкага таленту была б не прайсці праз яе разам з народам. Але Іван Паўлавіч прайшоў: «Я суткамі мерз у акопах, а перад маімі вачымі стаяла мае гарачае Палессе. Я месяцамі валяўся ў шпіталях – ля майго ўзгалоўя стаялі палешукі. Я пісаў раман аб вайне – яны стаялі за маімі плячыма, узбуйняючы маю фантазію…»

І мы ўдзячны лёсу, што ён адарыў нашага земляка выключным талентам слова і любові да людзей, да народа, а нас праз яго «Хроніку» яшчэ раз далучыў да ўсяго самага вяршыннага, што ёсць у сусветным мастацтве. Апошнія словы Івана Паўлавіча «Мне многае патрэбна. Галоўнае – паспець». Не паспеў… Разам з яго жыццём абарваліся жыццевыя сцяжынкі і яго герояў, якіх мы палюбілі. І мы ніколі не даведаемся, а што ж зрабілі Башлыкоў, Апейка, Ганна, Васіль?.. Ад усведамлення гэтага непарыўнага гора робіцца нясцерпна балюча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. «Успаміны пра Івана Мележа»: Скл. Л.Я.Пятрова-Мележ. – Мн.: Мастацкая літаратура. – 1982. – С. 397.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ